Рэгіна Гамзовіч, грамадскі эксперт у сферы аховы
нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі,
філолаг, журналіст, г. Мінск.

# ВЯСНОВЫ АБРАД “КАРАГОД” на свята Юр’я 6 мая

У 2004 годзе абрад “Карагод”, які захаваўся ў жывой традыцыі ў вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, стаў першым элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, якому быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, а ў 2019 годзе вясновы абрад “Юраўскі карагод” уключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова.





Ахоўны знак у вёсцы Пагост, каля яго — удзельніцы фальклорна-этнаграфічнага гурта “Міжрэчча”

У Лельчыцкім раёне захаваліся ў друкаваных крыніцах звесткі пра тое, што менавіта да Юр’я былі прымеркаваныя ініцыяцыі дзяўчат, якія вадзілі карагоды каля дубоў, а хлопцы сярод іх выбіралі сабе пару. Зараз абрад на свята Юр’е памятаюць толькі ў в. Іванава Слабада гэтага раёна. І то хутчэй за ўсё традыцыю ў гэтую вёску прынеслі сваякі Кацярыны Панчэні, якія тут жылі (таксама сям’я ратавалася тут і ў час ВАВ), бо нідзе ў іншых вёсках нічога падобнага не памятаюць. У вёсцы Лутmedian Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, што знаходзіцца на мяжы з Жыткавіцкім раёнам, і зараз водзяць “Карагод” на Юр’я. Падобны абрад памятаюць у некаторых вёсках Любанскага раёна. І гэта загадка – як ён туды трапіў.



Абрад “Карагод” у в. Іванава Слабада Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці



“Карагод” у вёсцы Лутmedian Столінскага раёна Брэсцкай вобласці



Абрад “Карагод” у вёсцы Хільчыцы Жыткавіцкага раёна Гомельшчыны

Юраўскі абрад “Карагод” некалі існаваў ва ўсіх вёсках Тураўшчыны на правабярэжжы Прыпяці (у 90-я гады 20 стагоддзя – толькі ў некаторых з іх – Пагост, Старажоўцы, Хільчыцы, Буразь, Запясочча, што зафіксавана ў фільмах БТ “Карагод” і “Вялесавы ўнукі” з цыкла “Радавод”) аднак у жывой традыцыі захаваўся толькі ў Пагосце.

  

На поле ў Пагосце ідуць моўчкі ў пэўным парадку, першым нясуць ручнік, праз які заходзяць на поле  і такім жа чынам выходзяць з поля.

  

На полі заклікаюць святога Юр’я выпусціць расу. Водзяць кругавы карагод, у цэнтры якога мужчыны



На полі на граблях вісіць зялёны фартух,
а падчас валачобніцтва па вёсцы - чырвоны

Усюды на Тураўшчыне 6 мая выпякалі адзін вялікі бохан пшанічнага абрадавага хлеба, упрыгожаны трыма каласкамі з цеста і трыма шышачкамі. Акрамя толькі вёскі Запясочча, дзе кожная дзяўчына выходзіла ў поле са сваім малым карагодзікам, бо гэтую вёску заснавалі лепшыя рамеснікі з розных вёсак Тураўшчыны, і гэтыя карагодзікі сімвалізавалі род кожнай дзяўчыны і яе вёску.

У абрадавы хлеб утыкалі тры галінкі пладовага дрэва, якое расцвіло ў гэтую пару. Іх абмотвалі цестам і падпякалі на агні. Называюцца гэтыя галінкі “ралцэ”, яны сімвалізуюць парасткі радавога дрэва.

  





Кожная галінка мае па тры адгалінаванні — усяго дзевяць парасткаў, якія сімвалізуюць 9 месяцаў сцельнасці каровы і цяжарнасці жанчыны. У гэтай сімволіцы і шанаванні каровы падчас першага выгану на пашу 6 мая, якое суправаджаецца замовамі, абярэгамі, пахлопваннем вярбой, частаваннем рагулькі абрадавым печывам пад назвай “хрэшчык” — сведчанне таго, што жыхары Тураўшчыны заўсёды памяталі, што яны індаеўрапейцы. Вядома, што культ каровы вельмі моцны ў Індыі, адкуль прыйшлі першапасяленцы Еўропы.

Хрэшчыкі выпякаюцца на Серадапосце для каровы, для ўсіх сямейнікаў і для пладнасці нівы – усяго тры штукі. Упрыгожваецца абрадавы абшчынны хлеб, які тут называюць “карагод”, як і сам абрад, гэтымі трыма галінкамі з трыма адросткамі, рознакаляровымі папяровымі кветкамі і стужкамі. Таксама выпякаюць птушачак з цеста і замацоўваюць іх на галінках, а ў сярэдзіну абшчыннага хлеба ставяць запаленую грамнічную свечку. Адбываецца гэта заўсёды ўрачыста пад спеў абрадавай песні. Фалькларыст Васіль Ліцвінка лічыў, што абрадавы хлеб-карагод сімвалізуе самога прыручанага племяннога быка тура. Калі гэты бык вымер у 16 стагоддзі, яго замяніў абрадавы хлеб.

.





Сякера, замкнуты замок, яйка і ніты ад кроснаў, а таксама спечаны на Серадапосце хрэшчык



Апошнюю карову ў Пагосце трымала сям’я Івана Пашэвіча.
Першы выган на Юр’я.

Толькі ў адной вёсцы на Тураўшчыне не пякуць вялікі абшчынны абрадавы хлеб, а кожная дзяўчына выходзіць у поле са сваім упрыгожаным каравайчыкам хлеба. Тлумачыцца гэта тым, што калі толькі было збудавана на Туравай Гарэ ўмацаванае замчышча, у месца побач з ім звезлі лепшых майстроў з усяго наваколля. Так было заснавана адно з прадмесцяў Турава — Запясочча, бо размясцілася яно за ракой Яцель (зараз – Язда), рэчышча якой амывала гарадзішча з аднаго боку і ўпадала ў раку Струмень (існуе дагэтуль) ў . А побач з ім за ракой Яцель — яшчэ адно прадмесце, якое назвалі Заяцелле.

Сведчанне таго, што тут жылі старажытныя індаеўрапейцы, вартае таго, каб апісаць яго больш падрабязна. Свята веснавога Юр'я з абрадам «Карагод» пачыналася некалі з першага выгану кароў на пашу на юр'еву расу. Дарэчы, як і ўсюды ў Беларусі. Аднак на Тураўшчыне былі свае асаблівасці, якія забываюцца з-за таго, што ў некаторых вёсках зараз зусім не трымаюць кароў або іх засталіся адзінкі. Некалі ж гэта быў урачысты і складаны рытуал.

На парог адрыны клалі яйка (каб кароўка была цэлая і здаровая ўсё лета), ніты ад кроснаў (каб ведьма, якая варожыць і адбірае малако ў кароўкі-карміцелькі, заблыталася ў нітках і не змагла выканаць сваю чорную справу) а таксама сякеру на ведзьмака, замыкаюць замок на цэп (каб замкнуць пашчы ваўкам).

Пасля гэтага асвечанай на Вербніцу галінкай вярбы пасцёбвалі рагульку, прамаўляючы замовы, накшталт гэтай: «Ідзі, кароўка, ў чэрэду не ззаду, не спераду, травічку паядай, вадзічку папівай і дарогу дадому не забывай».

Выгнаўшы з адрыны, частуюць кароўку хрэшчыкам (печыва ў выглядзе крыжа, спечанае на Серадапосце). Кароў праводзілі на выган, а пастухам прыносілі пачастункі яйкамі, салам, хлебам. Тыя здзяйснялі абярэгавыя дзеянні вакол стада (стада называюць «тавар» на мясцовай гаворцы).

Магчыма, у вельмі далёкія часы ў гэты дзень да кароў вадзілі прыручанага дзікага быка тура, які спарваўся з каровамі і даваў моцнае патомства. Вядома, што ад тура паходзяць усе еўрапейскія быкі і каровы. А вандроўнікі з далёкіх краін пакінулі сведчанне таго, што на Тураўшчыну прыплывалі, каб набыць кароў асаблівай пароды.

У памяці старажылаў вёскі Пагост захаваўся звычай, які іх продкі назіралі: надосвітку на свята Юр'я мужыкі абворвалі вёску на двух валах-блізнюках (ахоўная магія — абярэг на ўсё лета ўсіх жыхароў, іх хат, а таксама ўсёй гаспадаркі).

## Слова «карагод» і важнейшыя часткі абраду

Ва ўсіх расійскіх слоўніках слова “карагод” тлумачыцца як звычай “вадзіць хор”. І гэта памылка. Менавіта беларускі веснавы абрад на свята Юр’е дае правільны адказ на пытанне, што азначае гэтае слова. Яно складаецца з двух асноў – карв (бык) і вадзіць, што азначае звычай вадзіць дзікага прыручанага быка тура у поле, засеянага азімымі, - дзеля пладнасці нівы, жывёлы і людзей. Пры гэтым адбываецца ваджэнне па зялёным парасткам кругавых рухаў з заклікannем на зямлю сонечных праменняў і дажджу.





Турападобныя быкі ва ўрочышчы Рагі ў Пагосце

Дзяўчаты, якія дасягнулі палавой спеласці, далучаліся ў гэты дзень да жаночай супольнасці, каб навучыцца ўсяму неабходнаму для самастойнага жыцця ў шлюбе. Калі кожнаму малому дзіцяці ў любы час у якасці падарунка давалі адно курынае яйка з пажаданнем расці здаровым, то гэтым дзяўчатам на свята Юр’я падчас валачобніцтва па вёсцы пасля абраду ў полі выносілі па два яйкі як мінімальны падарунак – каб кожная знайшла сабе пару і прадоўжыла род. А калі шчодрая гаспадыня выносіла болей яек, то абавязкова цотным лікам. Такім чынам, на Юр’я адбываліся ініцыяцыі дзяўчат, сімвалам якіх былі фартухі - ахоўнікі жаночага лона: у поле хлопец на крыжавіне або граблях нёс зялёны фартух, а з поля чырвоны. А сімвалам дзявоцтва быў вянок з барвінку, які на Тураўшчыне заўсёды выкарыстоўваўся дзяўчатамі на свята Юр’я, а таксама на вяселлі.

  

  



Калі ўвесь абрад “Карагод” называлі дзявочым, то як сімвал аховы дзявоцтва і плоднасці, працягу роду былі хлопцы, якія пад кіраўніцтвам ваяводы (які нёс і падвышаў абрадавы хлеб) неслі ўсю астатнюю атрыбутыку: калядную зорку, абраз з ручнікам, граблі з фартухом. Спераду ішлі двое дзяўчат з ручнікам, праз які ўсе заходзілі на поле і вярталіся назад. Хлопцы з музыкам станавіліся ў цэнтр круга на полі, а жанчыны і дзяўчаты вадзілі вакол іх карагод (графічна гэта быў знак засеянага поля). Старэйшая жанчына закопвала ў зямлю акрайчык жытняга хлеба, перавязанага чырвонай стужкай. Святога Юр’я прасілі “адмукнуць зямліцу, выпусціць расіцу”, каб быў багаты ўраджай ды і людзям на здароўе. Тут жа, на полі, мянялі зялёны фартух на чырвоны, з ім ішлі валачобнічаць па вёсцы: ля кожнай хаты вадзілі такі ж карагод, як у полі, за што атрымлівалі ў падарунак яйкі цотным лікам, печыва і іншыя прысмакі.

 











Карагодная традыцыя на Тураўшчыне звязана з перыядам вясны. Калі ў апошні дзень Масленіцы спраўляюць абрад “Гу, вясна!”, заклікаючы надыход цяпла, птушак і сонейка, то з Вялікадня да Юр’я — перыяд уласна вясны.

У першы дзень Вялікадня пачынаюць вадзіць гульнёвыя карагоды, а завяршаюць на свята Юр’я ў цэнтры сяла пасля абраду ў полі і юраўскага валачобніцтва. Пасля гэтага ўжо спяваюць летнія песні з падводкай.












Тэматыка гульнёвых карагодаў звязана з працай у полі вясной (“А мы проса сеялі” – лінейны карагод на два шэрагі, кругавы “Кропе”), станам прыроды ў гэтую пару (“Селязень”, “Камарык”), ушанаваннем бабкі-пупарэзніцы (“Бабуся”), сямейным жыццём (“Пасеяў дзед рэпку, тры да ну”, “Дрэма”)

Нельга забывацца пра тое, што падчас свята Юр’я скончылася вясна, пачынаюць спяваць летнія песні з падводкай. У гэты дзень некалі песні гучалі да позняга вечара, не змаўкала музыка, усе танцавалі, а хлопцы гулялі у “мечыка”, “клёка” і іншыя рухомыя гульні.

*Абрад “Карагод“ у іншых вёсках*

**Рэканструкцыя абраду зроблена ў Любанскім раёне Мінскай вобласці на падставе традыцыі святкавання Юр”я веснавога ў вёсцы Закальное,** якая захавалася ў пасіўнай памяці (5 абрадавых песень, традыцыі і звычаі ў сям”і, першы выган кароў на пашу, выхад у поле з дзяўчатамі-падлеткамі, качанне ў расе і інш.). Гэта суседні з Тураўшчынай раён, аднак як туды трапіла традыцыя з Тураўшчыны — пытанне. Магчыма, праз перасяленцаў у гэтую вёску. Аднак песні і абрадавыя звычаі ў Любанскім раёне свае, асаблівыя.

**Вёска Луткі Столінскага раёна Брэсцкай вобласці** — памежная з Жыткавіцкім раёнам, таму натуральна, што там дагэтуль захаваўся абрад “Карагод”. Але ён выглядае збедненым з боку атрыбутыкі, сімволікі і жывой традыцыі вёскі Пагост.

**Вёска Іванава Слабада Лельчыцкага раёна** захавала абрад “Карагод” у памяці носьбітаў мясцовых традыцый, спявачак фальклорна-этнаграфічнага гурта “Журавінка”. Вёска знаходзіцца ў глыбіні Лельчыцкага раёна. У іх абрадзе важнейшы атрыбут пасля чырвонага фартуха на граблях (зялёны там не ўжываецца) — гэта ўпрыгожаная ёлачка, сімвал дзявоцтва, які выкарыстоўваецца таксама ўсюды на вяселлі, у абрадзе з карагоднымі традыцыямі на Стрэчанне ў вёсцы Новае Палессе, у абрадзе загукання вясны “Чырачка”ў апошні дзень Масленіцы ў вёсцы Тонеж (традыцыі жывыя ў гэтым раёне, маюць статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі).

Былая кіраўніца мясцовага гурта Вольга Карась тлумачыць сімволіку ёлкі ў абрадзе “Карагод”: “Чырвоная хустка сімвалізуе жыта ў полі, каб яно пад сонцам добра ўрадзіла. А яшчэ чырвоны бароніць ад граду і Перуна. Дык няхай каласочкі на нашым жыце шумляць, як коснічкі (стужкі) на ёлцы зіхацяць”. Некалі пасля абраду ў полі гурт абыходзіў усю вёску і вадзіў карагод каля кожнага падворку, зараз традыцыя заглохла. Якім чынам яна трапіла ў гэтую вёску або засталася тут даўжэй, калі існавала ў іншых вёсках — невядома. Паколькі ў гэтай вёсцы жылі сваякі з вёскі Пагост, то маці Кацярыны Панчэні — Антаніна Якаўлеўна Панчэня (дзявочае прозвішча Фірасовіч) — якая была цяжарная, а Пагост фашысты спалілі разам з жыхарамі 20 жніўня 1941 года, разам з дзецьмі прыехала сюды. Яна і іншыя сваякі падчас вайны маглі перанесці ў Слабаду сваю моцную традыцыю абраду “Карагод”. Да таго ж, у гэтай вёсцы было яшчэ шмат жанчын, якія нарадзіліся і жылі ў Пагосце або суседніх з Пагостам вёсках, а ў Слабаду

замуж зайшлі, то было з кім гэтую традыцыю тут прышчапіць. Кацярына Аляксееўна Панчэня ўзгадвала: "Тут жыла мая дваюрадная сястра Галя Сакалоўская па мужу, дачка Івана Рыгоравіча Карася З Пагоста, дачка Яраша і іншыя пагосцкія жанчыны і мужчыны. Хлопец Якавец узяў жонку са Слабады, іх дачка потым удзельнічала ў фальклорным калектыве "Журавінка".

Спявачкі гурта "Журавінка" памятаюць замовы, з якімі выганялі кароў на юраўскую расу 6 мая на свята Юр'я: ""Ідзі, кароўка, у поле, зялёную траву паядай, юр'еву расу папівай. Рожкамі адкаліся, ножкамі адбрыкніся, хвосцікам адмахніся, да сябе вядзьмарку не падпусці, а свой удой дамоў нясі! А ты, Юр'я, за таварам хадзі, стада глядзі,вечарам тавар дамоў вядзі!"

**У в. Блізніца Полацкага раёна, г. Высокае Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці, а таксама ў вёсках Рудня, Кольна, Боркі Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці (левабярэжжа Прыпяці)** культработнікі (магчыма, выпускнікі Універсітэта культуры, якія вывучалі традыцыю абраду "Карагод" вёскі Пагост, развучвалі песні і засвойвалі сэнс сімволікі абраду, прадстаўлялі яго ў сцэнічнай форме ў сваіх вёсках). Проста развучылі са сваімі калектывамі чужую традыцыю і перанеслі ў свае рэгіёны, дзе яе ніколі не было. Такі перанос чужых традыцый, з нашага пункту погляду, недапушчальны. Да таго ж, з левабярэжжа Прыпяці да Кацярыны Панчэні сярод іншых, не раз прыязджалі студэнткі, якія запісвалі ад яе песні і абрады. Магчыма таксама, што ў раёне працуюць культработнікамі пагастчанкі, якія лічаць, што могуць з поўным правам развучваць гэты абрад у іншым месцы. Але гэта не так. **Абрад "Карагод" — этнічны маркер жыхароў Тураўшчыны, лакальнага рэгіёнаУсходняга Палесся на правабярэжжы Прыпяці ў міжрэччы Сцвігі і Гарыні — знаходзіцца пад аховай ЮНЕСКА, таму патрабуе чысціні традыцыі і павагі.**

***Падсумоўваючы, важна выдзеліць асноўныя этнічныя маркеры жыхароў Тураўшчыны і вялікую ролю вёскі Пагост у іх захаванні да нашага часу, а менавіта:***

1) **Месцазнаходжанне ў сутоку рэк Сцвіга і Прыпяць (Прыпяць - прыток Дняпра, дзе з даўніх часоў праходзіў водна-гандлёвы шлях "З варгаў у грэкі"— з Балтыйскага мора ў Чорнае) садзейнічаў фарміраванню ў гэтым месцы, дзе ўтварылася вёска Пагост, гандлёвага, рэлігійнага, палітычнага і культурнага цэнтра для жыхароў Тураўшчыны — тэрыторыі ў міжрэччы Сцвігі-Прыпяці-Гарыні.** Падчас веснавога разліву рэк гэта давала магчымасць заходу на тэрыторыю гэтага міжрэчча не толькі вялікіх рачных суднаў, але і марскіх.

   Замежныя вандроўнікі і гандляры сведчылі, што сюды прыплывалі здалёк, каб набыць каштоўную пароду кароў. Мясціна ля вёскі Пагост добра падыходзіла для мэты абмену таварамі, бо пранікненне чужакоў у глыб тэрыторыі было небяспечным.

   З цягам часу мясціна збору палюддзя стала адыгрываць ролю цэнтра сельскай акругі, дзе працягвалася шанаванне каменнага крыжа – святыні жыхароў Тураўшчыны, затым рэлігійным цэнтрам з вялікай Сціхвінскай царквой, гандлёвым кірмашовым цэнтрам на восеньскае свята Узвіжанне. Тут сфарміраваліся важныя агульныя этнічныя рысы насельніцтва, якія праяўляліся ў мясцовай гаворцы, адзенні, сямейных і каляндарных абрадах і звычаях, важнейшых рамёствах і промыслах.

2) Згодна мясцовага падання, **да ўзнікнення Турава існаваў горад, які цягнуўся ад Пагоста да Аздаміч і меў назву Хіль**, а цэнтр гэтага горада знаходзіўся на месцы цяперашяй вёскі Хільчыцы. Пазней Тураў пераняў ад таго старажытнага цэнтра структуру горада, які складаўся з умацаванага адміністрацыйнага цэнтра, вакол якога існавалі сельскія паселішчы з пэўнымі функцыямі забеспячэння жыццядзейнасці гэтага горада. З вельмі даўніх часоў вёска Пагост фігуравала як усходняя мяжа старажытнага адміністрацыйнага цэнтра пратагорада дрыгавічоў. Да таго ж, вельмі важная, бо тут сыходзіліся водныя шляхі Сцвігі і Прыпяці, якія аб'ядноўвалі насельніцтва і фарміравалі яго этнічную еднасць.

3) Тапаніміка Тураўшчыны, а ў першую чаргу **культурны ландшафт горада Турава**, вартыя ўключэння ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, бо захаваліся гістарычныя назвы, якія сведчаць пра іх функцыі ў далёкім мінулым. Роля тэрыторыі на месцы сучаснай вёскі Пагост ужо ў тыя часы параўнальна з іншымі населенымі пунктамі была адметнай.

**Пагост** – месца збору палюддзя (штогадовай даніны князю), пазней — цэнтр сельскай акругі з царквой і могілкамі, які захоўваў і святыню жыхароў Тураўшчыны – каменны Чэсны крыж (або Крыж Божай маці).

**Азяраны** – мясціна з азёрамі і штучнымі каналамі  каля вёскі Пагост.

**Крэмна** – месца, дзе размяшчалася крэпасць, акружаная крамлёным дрэваколам (адсюль ад крамлёнага дрэва і назва “крэмль”).

**Старажоўцы** — мясціна, дзе жылі з сем’ямі вартаўнікі і адкуль яны выязджалі вартаваць адзіны сухапутны шлях у глыбіню тэрыторыі спачатку цэнтра пратакняства горад Хіль, а затым і цэнтра княства горада Тураў, заснаванага легендарным князем Турам.

**Сямурадцы** – вёска, дзе жылі сем тураўскіх жрацоў, дарадцаў князя, якія “суды судзілі” яго падданым.

**Буразь** – летапісная назва, звязаная з заснаваннем горада Турава: тут князь Тур з дружынай “быкоў разіў” і ўбачаў вешчы сон, што на гэтым месцы трэба заснаваць горад.  (добра было б абазначыць у гэтай вёсцы, што паходжанне назвы летапіснае, звязанае з заснаваннем горада Турава)

**Запясочча** – назва аднаго з прадмесцяў Турава, куда пасялілі за водным каналам вакол гарадзішча лепшых рамеснікаў з усяго наваколля.

**Заяцелле** — другое прадмесце Турава за ракой Яцель (мясціна патрабуе абазначэння гістарычнай назвы)

**Чэрнічы** – дзе быў заснаваны манастыр і жылі манахі.

**Слепцы** – месца пражывання сляпых і іншых калек (перайменавана ў Знаменку, патрабуе пазначэння яе гістарычнай назвы).

**Дварэц** – тут размяшчаўся гаспадарчы двор князя (зараз вёска ўвайшла ў межы горада Турава, таму гэтая частка горад патрабуе пазначэння яе гістарычнай назвы).

**Хільчыцы** – ля вёскі трэба ўстанавіць знак, які сведчыць, што, згодна народнаму паданню, **да Турава тут існаваў дрыгавіцкі пратагорад Хіль.**

Цікава, што ў Столінскім раёне таксама ёсць вёскі, назва якіх звязана з гісторыяй Тураўшчыны. Так, **Талмачава** – вёска, дзе жылі талмачы — перакладчыкі.
**Семігосцічы** – хутчэй за ўсё назва звязана з нейкімі сям’ю купцамі (якіх называлі “госці”). Магчыма, заплыўшы вясной так далёка, яны вымушаны былі там зімаваць, бо летам вада ад разліву рэк спала, і яны не змаглі вярнуцца.
**Цераблічы** – вёска, якую выцерабілі (знішчылі жыхароў) захопнікі — цікавая, разам з этнаграфічным музеем, створаным краяведам, мастаком і разьбяром па дрэву Іванам Супрунчыкам, які сабраў мясцовыя паданні, легенды, гісторыі з жыцця продкаў. Сярод іх — пра тое, як адзін цераблiцкі жыхар забіў цяля і дзяліў яго паміж суседзямі, суправаджаючы каментарам, чаму той або іншай часткай асвежаванага бычка ён надзяляў

пэўнага чалавека. Гэтае дзяленне бычка можа быць цікавым для тэмы культу дзікага быка тура на Тураўшчыне.

**Аздамічы** — магчыма, назва ўтворана ад імя Аздам. Вёска знаходзіцца на заходняй мяжы легендарнага дрыгавіцкага пратагорада Хіль. Ля царквы —каменны крыж, спераду якога можна ўбачыць касы крыж (у дахрысціянскія часы такая выява належала Вялікай Багіні, у эпоху бронзы яна стала лічыцца мужчынскім знакам).



Аздаміцкі крыж.

4) **Мікратапаніміка і гідраніміка вёскі Пагост** мае архаічныя звесткі, звязаныя з культам дзікага быка тура на гэтай тэрыторыі, замацаваныя ў акаляючым прыродным асяроддзі. Яна таксама патрабуе аховы і папулярызацыі як гістарычнае сведчанне таго, што менавіта на гэтай тэрыторыі склалася шанаванне быка тура і захаваліся да нашага часу звязаныя з ім абрадавыя дзеянні.



Пратока Тур у Пагосце



Турападобныя быкі Хека ва ўрочышчы Рагі каля пратокі Тур

Менавіта тут месца нядаўняга выпасу жывёл у сутоку рэк Сцвіга і Прыпяць называецца **Рагі**. Такім чынам, **рэкі на гэтай зямлі як бы фіксуюць тэрыторыю шанавання быка тура і ўвасабляюць самыя моцныя часткі яго цела - рогі**. Пасярэдзіне паўвострава ў гэтым сутоку рэк у цэнтр сяла ад Прыпяці і Сцвігі вядзе яўна рукатворная **пратока Тур**. Гісторыкі лічаць, што менавіта яна магла даць назву гораду Тураву. Ды і мясцовае паданне пра вёску Пагост сведчыць: “Пагост снаваўся (быў заснаваны) раней за Тураў”. Ролю рагоў быка тура адыгрываюць рэкі Прыпяць і Сцвіга.

**5)** Насельніцтва Тураўшчны не было этнічна едным, пра што сведчыць 5-томны Тураўскі слоўнік і атлас гаворак Тураўшчыны. Аднак сумеснае пражыванне ва ўмовах тэрытарыяльнай ізаляцыі ад знешніх інаэтнічных уплываў, якая была звязана са штогадовымі веснавымі разлівамі рэк, садзейнічала фарміраванню агульных эканамічных, адміністрацыйных і культурных сувязей, якія **з’ядналі гэтае насельніцтва. Важнейшым на Тураўшчыне быў абрад “Карагод” 6 мая, які спраўлялі ў дзень Вясновага Юр’я. Ён звязаны з культам быка тура, паколькі само слова “карагод” азначае звычай вадзіць прыручанага быка тура . Слова “каравай” складаецца са слоў “карв” (бык) і “ваяць” (ствараць выяву гэтага быка).**

6) Замужнія жанчыны на тэрыторыі Тураўшчыны яшчэ да ВАВ ў 20 стагоддзі апраналі ў царкву падчас вялікіх святаў (Вялікдзень, Тройца) традыцыйныя строі з адметным ручніковага тыпу галаўным уборам пад назвай “**галава” або “галовачка”,** які пэўным чынам навіваўся на “рагаты” каркас. Такі галаўны ўбор сведчыць пра **даўні культ быка тура**.






Рэканструкцыі тураўскіх жаночых строяў з “рагатымі” галаўнымі ўборамі, малюнак каркаса і фота - Марыі Віннікавай.

Былі такія ўборы і ў Пагосце – іх навівалі маладой падчас вяселля, абазначаючы гэтым змену яе сацыяльнага становішча. **Падобныя галаўныя ўборы насілі толькі на Тураўшчыне, што з’яўляецца адным з этнічных маркераў жыхароў гэтага краю**. Іх апісала разам са спосабамі навівання і працягвае вывучаць у музеях Санкт-Пецярбурга ў навітым стане мастацтвазнаўца Марыя Віннікава. У 19-20 стагоддзях яны былі вывезены з розных вёсак Тураўшчыны.

**7) Толькі на гэтай тэрыторыі фіксуецца шанаванне каменных крыжоў, якія, згодна мясцовых паданняў, прыплылі сюды супраць цячэння з Кіева.**



Пагосцкі каменны Чэсны крыж



Крыж у вёсцы Вільча ў міжрэччы рэк Прыпяці і Случ

Гэта звязана з хрысціянізацыяй пазначанай тэрыторыі Тураўшчны і з асобай кіеўскай княгіні Вольгі, якая першай з рускіх князёў прыняла хрысціянства і ўстанаўлівала ў месцах збору палюддзя каменныя крыжы. Гісторыю з’яўлення тут гэтых крыжоў неабходна папулярызаваць і надалей, уключаць у турыстычныя маршруты і ладзіць вандроўкі да гэтых крыжоў, якія шануюцца не толькі ў правабярэжных ад Прыпяці вёсках Жыткавіцкага раёна, але і ў Лельчыцкім раёне, а таксама ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці. І ўсюды захоўваюцца звязаныя з імі паданні.

8**) Абрад “Жаніцьба Коміна**” існаваў толькі на Тураўшчыне, бо толькі тут для асвятлення хаты лучынай у халодную пару года выкарыстоўвалася своеасаблівае прыстасаванне – светач або комін, пасвет. Гэты абрад маркіраваў зімовы перыяд у традыцыйнай культуры жыхароў гэтага краю, прысвечаны вырабу адзення і абутку, звязаны з шанаваннем хатніка, продкаў, агню.

  

9) Усе каляндарныя абрады гадавога кола звязаны з **шанаваннем хлеба** і ўключаюць такі важны атрыбут, як каласкі жыта або пшаніцы. Абрадавы хлеб абавязкова меў круглую форму, як сонца.

10) Звычай памінання продкаў адбываўся ў пятніцу і суботу, называўся адпаведна **Дзяды і Бабы.** Пры гэтым на стол падавалі 12 страў, сярод іх абавязковыя абрадавыя стравы — канун з каржоў і мёду, куцця, тонкія бліны, а завяршалася трапеза кашай з проса (пшана).

11) **Веснавы перыяд на Тураўшчыне пачынаўся на Стрэчанне або ў апошні дзень Масленіцы** загуканнем вясны і абрадам “Гу, вясна!”, а на Убарцкім Палессі абрадам “Чырачка” і карагоднай традыцыяй.

12) **Уласна веснавы перыяд у вёсцы Пагост пачынаўся з Вялікадня шанаваннем памяці продкаў і ваджэннем традыцыйных карагодаў, а завяршаўся на свята Юр’я 6 мая** традыцыямі першага выгану кароў у поле, абворваннем вёскі на двух влах-блізнюках і абрадам “Карагод”. У гэты дзень апошні раз карагодзілі, пасля чаго спявалі летнія песні з падводкай.

*Фотаздымкі з архіва Р.С.Гамзовіч*

*Матэрыялы для сайта Тураўскага краязнаўчага музея падрыхтаваны ў рамках праекта “Рэалізацыя плана ахвы вясновага абраду “Юраўскі карагод” в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, уключанага ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова” пры падтрымцы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)*

*Больш пра праект чытайце на сайце “Жывая спадчына Беларусі”:*
*https://living-heritage.by/unesco/yura-sk-karagod/*

*У рамках праекта падрыхтавана навукова-папулярнае выданне:*
*Нематэрыяльная культурная спадчына Тураўшчыны : анталогія / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Фонд нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА ; рэдкал. : А.Т. Каліноўская, А.Б. Сташкевіч, А.В. Гумінская. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2023. – 184 с. : іл.*

*Электронная версія выдання апублікавана на сайце “Жывая спадчына Беларусі”:*
*https://living-heritage.by/publications/Anthology_ICH_Turau_area_2023.pdf*